***Н. У. Самерсава,***
*прафесар кафедры педагогікі СКД,*
*кандыдат педагагічных навук, дацэнт*

# СТАНАЎЛЕННЕ І РАЗВІЦЦЁ МЕТАДЫЧНАГА ЗАБЕСПЯЧЭННЯ САЦЫЯЛЬНА-КУЛЬТУРНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

Для абазначэння метадычнага забеспячэння сацыяльна-культурнай дзейнасці як адмысловага віду метадычнага кіраўніцтва, ужываліся розныя тэрміны: «арганізацыйна-метадычная работа», «метадычная дапамога», «абагульненне і ўкараненне передавога вопыту», «метадычнае кіраўніцтва». Пры гэтым гаворка ідзе не проста аб выцясненні аднаго тэрміна іншым, якія адлюстроўваюць адзін і той жа змест, а, па вызначэнні Г. М. Біржэнюка, Л. В. Бузене, Н. А. Гарбуновай, аб «пэўных паслядоўных кроках па выяўленні новых граняў разглядаемай з’явы, узбагачэнні яе функцый, паглыбленні разумення яе сутнасці, межаў і ролі ў агульным працэсе кіраўніцтва сацыяльна-культурнай дзейнасцю на розных узроўнях» [1, с. 8].

Для таго, каб разгледзець сучасны стан метадычнага забеспячэння сацыяльна-культурнай дзейнасці, надзвычай важна прасачыць гісторыю яго станаўлення і развіцця, выявіць ключавыя моманты, якія адлюстроўваюць яго спецыфіку. Не выклікае сумнення тое, што гісторыю метадычнага забеспячэння сацыяльна-культурнай дзейнасці патрэбна разглядаць у кантэксце гісторыі самой сацыяльна-культурнай дзейнасці. Разам з тым, варта адзначыць, што на сённяшні дзень усё яшчэ няма сур'ёзных даследаванняў, якія абагульнілі б усю гісторыю сацыяльна-культурнай дзейнасці ў Беларусі ад яе зараджэння і да сённяшняга дня, раскрылі заканамернасці і дынаміку яе развіцця. Недастаткова даследаваны перыяды (этапы) у вывучэнні асобных з'яў гісторыі сацыяльна-культурнай дзейнасці.

Аналізуючы працэс станаўлення арганізацыйнай структуры метадычнага забеспячэння, неабходна адзначыць, што яна ствармалася пастуопова, эмпірычным шляхам, абапіраючыся больш на аналогію з іншымі галінамі, звыклыя схемы і нават інтуіцыю, чым на ўлік асаблівасцяў метадычнай працы ды ўласцівыя ёй заканамернасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Першыя прыкметы метадычнай дзейнасці на Беларусі ў галіне культуры пачалі з’яўляцца ў пачатку ХХ стагоддзя. Гэта былі народныя дамы, дзе працавалі самадзейныя гурткі, праводзілі канцэрты, чыталі лекцыі. Вялікую цікавасць выклікала тэатральнае мастацтва. У народных дамах ствараліся і працавалі народныя тэатры, падчас работы якіх выпрацоўваліся асновы пэўнай сістэмы аказання ім метадычнай і арганізацыйнай дапамогі. Станаўленне сацыяльна-культурнай працы, стварэнне сеткі ўстаноў культуры, зараджэнне і развіццё формаў і метадаў іх дзейнасці патрабавалі прынцыпова новых падыходаў да арганізацыі працы, яе метадычнага забеспячэння. У гэты перыяд з’яўляюцца «парасткі» – элементы метадычнай дзейнасці. Аднак характарызаваць яго як вяху, прыступку, этап у станаўленні метадычнага забеспячэння сацыяльна-культурнай дзейнасці, на наш погляд, няма падстаў.

Мы не можам не згадзіцца з расійскім даследчыкам пытанняў станаўлення метадычнага забеспячэння сацыяльна-культурнай дзейнасці С. В. Сабуцкай, якая сцвярджае, што перыядызацыю развіцця тэарэтычных поглядаў на гэтую праблему і фарміравання яго арганізацыйнай структуры можна адлічваць з 1917 года [2].

Так, на першым этапе (1917–1922) закладваюцца асновы метадычнай работы ў культурна-асветніцкіх установах. Актыўнае паслярэвалюцыйнае ўключэнне народных мас у працэс падрыхтоўкі і правядзення вялікай колькасці агітацыйных і культурна-масавых мерапрыемстваў выклікала актуальную патрэбу ў распрацоўцы агульных прынцыпаў, прыёмаў, метадаў арганізацыі гэтага віду сацыяльна-культурнай дзейнасці насельніцтва. Каб ацаніць сваю дзейнасць, хутчэй пераняць цікавы, удалы вопыт, культасветнікі самі імкнуліся да метадычнага аб'яднання. Сярод разнастайных метадычных аб'яднанняў практыкаў культурна-асветніцкай работы гэтага перыяду асабліва характэрнымі былі: «базісныя бібліятэкі», дзейнасць якіх будавалася на ўзаемным інструктаванні спецыялістаў; «цэнтраклубы», у задачы якіх уваходзіла аб’яднанне спецыялістаў – арганізатараў культурна-асветніцкай працы для абмену думкамі аб падрыхтаваных імі ж мерапрыемствах; «Агітпараходы», што выконвалі, акрамя сваёй асноўнай агітацыйнай місіі, і ролю перасоўнага метадычнага цэнтра, падтрымлівалі інфармацыйную сувязь з метадычнымі групамі на

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

месцах; «кабінеты пазашкольніка», якія забяспечвалі практычную і лабараторную работу метадычных аб'яднанняў.Для сістэматычнага кваліфікаванага збору метадычнай инфармацыі з месцаў, яе аналізу з мэтай рэгулявання працэсу стварэння методыкі культурна-асветніцкай работы і з’явілася сістэма *метадычнага кіраўніцтва.*

Працэс актыўнага асваення методыкі работы культурна-асветніцкімі ўстановамі вызначае другі этап (1923–1925), калі метадычная праца на месцах пачала істотна ўзмацняцца. Установы культуры назапасілі ўжо досыць шырокі арсенал формаў, сродкаў і метадаў працы. Узнікла неабходнасць у распаўсюджванні лепшых дасягненняў у галіне накіраванай метадычнай дзейнасці. У той жа час з’явілася настойлівая патрэба ў тым, каб спецыяліст-метадыст быў максімальна набліжаны да практыкі, але не адарваны і не ізаляваны ад цэнтра. Для гэтага сталі ствараццa адмысловыя ўстановы – *метадычныя кабінеты, метадычныя бюро.* У гарадах з’яўляюцца палацы і дамы культуры, на вёсцы – саўгасныя і калгасныя клубы, якія сталі кшталту метадычных цэнтраў сваіх тэрыторый. У той жа час найбольш актуальнай з’яўлялася задача давесці да кожнага практычнага работніка дасягненні методыкі, навучыць творча выкарыстоўваць яе ў паўсядзённай дзейнасці.

Трэці этап станаўлення сістэмы метадычнага кіраўніцтва культурна-асветніцкай працай (1926–1927) адрозніваецца грунтоўным абмеркаваннем шматлікіх праблем метадычнага кіраўніцтва на самым высокім узроўні. Менавіта ў гэты перыяд склаўся погляд на метадычнае кіраўніцтва як на звяно кіравання культурна-асветніцкай работай, удасканаленне яе форм і метадаў.

Чацвёрты этап (1928–1932) хранaлагічна супадае з перыядам, пазначаным у гісторыі культурна-асветніцкай працы як *культпаход.* Рашэнне задачы, што была пастаўлена перад гэтым масавым рухам, – мабілізаваць грамадскія сілы на барацьбу з непісьменнасцю і звязаным з ёй бескультур’ем ў побыце – было непарыўна звязана з карэнным паляпшэннем работы культурна-асветніцкіх устаноў. Адпаведна, узрастала роля сістэмы метадычнага кіраўніцтва, паколькі неабходна было ў кароткі тэрмін павысіць якасць методыкі, якая выкарыстоўвалася ў практыцы. Метадычнае кіраўніцтва дадзенага перыяду характарызавалася паглыбленай увагай да распрацоўкі тэхна-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

лагічных праблем. Аднак упарадкаванне тэхналагічных аперацый у канчатковым рахунку адмоўна адбілася на развіцці метадычнага кіраўніцтва: яно станавілася ўсё больш стандартным.

Тэндэнцыяй рэгламентацыі метадычнага кіраўніцтва адзначаецца пяты этап яго станаўлення і развіцця (1933–1955). Рэгламентацыя абсалютна ўсіх аспектаў дзейнасці клуба, бібліятэкі і г. д. зрабіла шмат у чым бессэнсоўнымі спробы ўнесці творчы пачатак у працу, разнастаіць яе методыку. Таму пытанне аб метадычным кіраўніцтве ў тыя гады ставілася толькі намінальна.

Аднак было б несправядліва не адзначыць некаторыя пазітыўныя моманты гэтага перыяду. Перш за ўсё, гэта захаванне метадычнага забеспячэння культурна-асветніцкай дзейнасці ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Дамамі народнай творчасці ажыццяўляліся камандзіроўкі творчых работнікаў на фронт для пастаноўкі канцэртных праграм армейскай самадзейнасці. Фарміраваўся рэпертуар, праводзілася сур’ёзная работа з кампазітарамі і драматургамі па стварэннітвораў для армейскай самадзейнасці.

Аднак яшчэ раз адзначым, што самы працяглы перыяд развіцця метадычнага забеспячэння сацыяльна-культурнай дзейнасці аказаўся перыядам «застою» навуковай метадычнай думкі.

Супярэчлівыя тэндэнцыі ў змесце і характары арганізацыі метадычнай работы культурна-асветніцкіх устаноў характарызуюць шосты этап станаўлення і развіцця метадычнага забеспячэння (1956–1965). У азначаны перыяд назіраецца прыкметнае ажыўленне цікавасці даследчыкаў да праблем метадычнага забеспячэння сацыяльна-культурнай дзейнасці. Між тым, адбываліся змены ў бок «дыферэнцыраванага» метадычнага кіраўніцтва. Метадычныя ўстановы ажыццяўлялі кіраўніцтва рознымі відамі культурна-асветніцкай работы: адны ажыццяўлялі метадычнае кіраўніцтва масавай работай клубаў, другія – у галіне клубнай мастацкай самадзейнасці і інш. Такая схема не магла адказваць патрабаванням, якія прад’яўляюцца да метадычнага кіраўніцтва культурна-асветніцкай работай, таму што ў ёй адсутнічалі многія сутнасныя рысы сістэмы. Негатыўна адбівалася і наяўнасць ведамасных бар’ераў у метадычным кіраўніцтве. Кожнае ведамства стварала сваю сістэму, што не спрыяла захаванню адзінай метадычнай палітыкі. У дзейнасці дамоў народнай творчасці і метадычных кабінетаў культурна-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

асветніцкай работы не хапала навуковай асновы, мэтанакіраванасці, актыўнасці ў пошуку новых эфектыўных сродкаў і формаў культасветработы.

Узмацненне застойных з'яў у арганізацыі метадычнага кіраўніцтва культурна-асветніцкай работай – характэрная рыса сёмага этапа (1966–1978), звязанага са зменай арганізацыйнай структуры метадычнага кіраўніцтва. Даследчыкі адзначаюць, што адным з недахопаў гэтага перыяду з'яўляецца пагоня за колькаснымі, а не якаснымі паказчыкамі. У творчасці квітнее фармалізм, нараджаюцца застойныя з'явы ў сацыяльнай адукацыі. Хоць у пастановах тых гадоў партыя нацэльвала на выкарыстанне патэнцыялу клубаў, бібліятэк, музеяў, народных універсітэтаў і іншых устаноў, але, па сутнасці, усе яны былі арыентаваны на спажывецкае далучэнне да ведаў і культуры, а не на самадзейнасць [3; 4].

Укараненне навукі ў працэс метадычнага забеспячэння культурна-асветніцкай работы вызначаецца пачынаючы з 1979 па 1990 гг. На аснове аб'яднання дамоў народнай творчасці і метадычных кабінетаў пачалі функцыянаваць навукова-метадычныя цэнтры народнай творчасці і культурна-асветніцкай работы, выбудаваныя на аснове рэгіянальнага прынцыпу. Былі створаны Усесаюзны, рэспубліканскія, абласныя навукова-метадычныя цэнтры. Так, у сталіцы правапераемнікам Мінскага абласнога Дома народнай творчасці (1939) стаў Мінскі абласны навукова-метадычны цэнтр народнай творчасці і культурна-асветнай работы, які быў створаны ў 1980-м. Такія ж установы былі адкрыты ва ўсіх абласных цэнтрах Беларусі.

У арсенале форм работы метадычных цэнтраў – правядзенне аглядаў, конкурсаў, фестываляў народнай творчасці, навукова-метадычных і навукова-практычных канферэнцый, семінараў, творчых лабараторый, школ перадавога вопыту і г. д. Метадычныя цэнтры на аснове вынікаў аналізу справаздач, статыстычных даных, рэпертуару і ўзроўню працы самадзейных калектываў вызначаюць становішча і тэндэнцыі развіцця культуры, самадзейнай творчасці. Акрамя таго, яны назапашваюць і сістэматызуюць метадычныя матэрыялы, спецыяльную літаратуру, займаюцца інфармацыйна-выдавецкай дзейнасцю.

Многія даследчыкі сыходзяцца ў меркаванні, што ў пачатку 1990-х наступіў новы, сучасны этап развіцця паняцця «мета-



РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

дычнае забеспячэнне сацыяльна-культурнай дзейнасці». Звязаны ён з пераменамі, распачатымі ў палітычным, эканамічным і культурным жыцці нашай краіны. Беларусь стала незалежнай дзяржавай са сваім грамадска-палітычным жыццём, у якім пачаўся працэс рэальнага аднаўлення галоснасці ва ўмовах рыначных адносін [5; 6].

Вельмі значным у гэты перыяд часу з'яўляецца той факт, што са зменай ідэалагічных вех у постсавецкім беларускім грамадстве 90-х гадоў XX ст. пачаўся інтэнсіўны перагляд навуковай і прафесійнай тэрміналогіі. Па словах М. М. Ярашэнкі, менавіта ў гэты час упершыню была вызначана ідэя новага, сацыяльна-арыентаванага падыходу да аналізу традыцыйнай дзейнасці ўстаноў культуры [7].

На сённяшні час метадычнае забеспячэнне разглядаецца не як кіраўніцкі працэс, а як адна са сфер, адзін з напрамкаў метадычнага кіраўніцтва, і па сваёй сутнасці і прызначэнні прадугледжвае стварэнне «сэрвісных» умоў у абслугоўванні і забеспячэнні передавой методыкай практыкаў клубных устаноў.

Перамены, што пачаліся ў сацыяльна-культурным і эканамічным жыцці краіны пры набыцці суверэннасці і пераходзе да рыначных адносін, аказалі і аказваюць значны ўплыў на дзейнасць метадычных органаў усіх узроўняў. Абласныя цэнтры народнай творчасці на Беларусі – гэта шматфункцыянальныя цэнтры, у якіх аспекты захавання традыцыйнай культуры, развіцця аматарскай творчасці вызначаюць змест каардынацыйна-метадычнай, інфармацыйна-аналітычнай, праектна-праграмнай, даследча-збіральніцкай, арганізацыйна-творчай і выдавецкай работы.

1. Методическое руководство культурно-просветительной работой : учеб. пособие для студентов ин-тов культуры / Г. М. Бирженюк, Л. В. Бузене, Н. А. Горбунова. – М. : Просвещение, 1989. – 176 с.

2. *Сабуцкая, С. В.* Формирование системы методического обеспечения социально-культурной деятельности в регионе : дис. … канд. пед. наук : 13.00.05 / С. В. Сабуцкая. – Кемерово, 2006. – 242 с.

3. *Жаркова, Л. С.* Деятельность учреждений культуры : учеб. пособие / Л. С. Жаркова. – 3-е изд., испр. и доп. – М. : МГУКИ, 2003. – 225 с.

4. *Киселева, Т. Г.* Социально-культурная деятельность : учебник / Т. Г. Киселева, Ю. Д. Красильников. – М. : МГУКИ, 2004. – 539 с.

5. *Ковальчук, А. С.* Социально-культурная деятельность / А. С. Ковальчук. – Орел : Орловский гос. ин-т искусств и культуры, 2000. – 172 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

6. *Литовкин, Е. В.* Теоретико-методологические проблемы современной истории социально-культурной деятельности / Е. В. Литовкин // Социально-культурная деятельность: история, теория, образование, практика : межвузовский сборник научных статей / ред-сост. В. В. Туев. – Кемерово : КемГАКИ, 2002. – 177 с.

7. *Ярошенко, Н. Н.* История и методология теории социально-культурной деятельности : учебник / Н. Н.Ярошенко. – М. : МГУКИ, 2007. – 360 с.

***В. В. Сащеко,***
*кандидат культурологии,*
*доцент кафедры театрального творчества*

## ПРОБЛЕМА КУЛЬТУРНОГО КОНТЕКСТА В ПОЭМЕ М. ЦВЕТАЕВОЙ «КРЫСОЛОВ»

Подлинный смысл любого художественного произведения раскрывается лишь при верном понимании его контекста. Само понятия контекста полифонично – оно вбирает в себя не только смысловые связи внутри отдельного текста. Контекстуальность отражает широкие диалогические связи текста с культурно-историческим фоном, сопутствовавшим созданию какого-либо художественного произведения. Культурологическое исследование этого фона («второго плана» в терминологии театрального искусства) позволит выявить подлинные смыслы, составляющие ядро художественного произведения.

По словам М. Бахтина, «всякое литературное произведение внутренне, имманентно социологично, <…> каждый элемент его формы пронизан живыми социальными оценками» [1, с. 181]. Опираясь на эту мысль, попытаемся взглянуть на поэму М. Цветаевой «Крысолов» как на произведение, в котором отражается диалог автора с эпохой, и выявить особенности этого диалога. Исследование поэмы имеет целью определение диалогических связей двух важнейших для понимания художественного текста уровней. Первый уровень зримый (эксплицитный) – текст. Второй уровень – подразумеваемый (имплицитный) – уровень контекста, подтекста (подлинного, скрытого за словами смысла) и надтекста (символического смысла).

В культурологическом ракурсе текстом поэмы является средневековая немецкая легенда о Крысолове, который освободил город Гаммельн от нашествия крыс, но не получил за это обещанной платы и в отместку увел из города всех детей и



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ